# Тэкст

## § 2. Тэкст і яго асноўныя прыметы. Падтэмы тэксту. Ключавыя (апорныя) словы і сказы ў тэксце

**Успамінаем і паўтараем**

**7.** Дапоўніце выказванні.

... — гэта выказванне, у якім сказы звязаны па сэнсе і граматычна.

Сказы ў тэксце аб'яднаны тэмай і асноўнай думкай.

... — гэта тое, пра што гаворыцца ў тэксце.

... — гэта тое галоўнае, што выказаў аўтар у тэксце. Яна перадае адносіны аўтара да напісанага, яго ацэнку падзей ці з'яў.

Да тэксту можна падабраць ... . У ім могуць быць выказаны як тэма тэксту, так і яго асноўная думка.

Раскажыце, што вы ведаеце пра тэкст. Чым ён адрозніваецца ад асобных сказаў?

**8.** Вызначце, якія з загалоўкаў перадаюць тэму, а якія — асноўную думку. Абгрунтуйце сваё меркаванне.

«Летні дзень», «Дары лесу», «Слаўны сын з Полацка», «Шчодрыя дары лесу», «Летні дзень год корміць», «Падарожжа па родным краі», «Ніколі не забудзем!», «Родная зямля», «Любіць і шанаваць родную зямлю».

**9.** Разгледзьце схемы спосабаў сувязі сказаў у тэксце. Якая схема адпавядае паслядоўнаму спосабу, а якая — паралельнаму? Раскажыце, як звязваюцца сказы ў тэксце пры паслядоўнай сувязі, паралельнай сувязі.

1) 1 → 2 → 3 → 4



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

2)




Праілюструйце кожны спосаб сувязі ўласнымі прыкладамі.

**10.** Ці можна назваць прыведзенае выказванне тэкстам? Чаму? Спішыце, правільна афармляючы пачатак і канец кожнага сказа.

Увосень на пустцы побач са школай дзеці пасадзілі каштаны саджанцы былі маладыя і тонкія, таму ўсю зіму дзеці перажывалі, ці не змерзнуць яны, ці прымуцца і вясной на ўсіх шасці дрэўцах з'явіліся вялікія, радасна-зялёныя лісточкі каштаны прыняліся былая пустка стала вельмі ўтульным і вясёлым месцам *(Паводле Г. Пшонік)*.

Як вы разумееце сэнс слова *пустка (на пустцы)*? Ад якога слова яно ўтворана?

Назавіце прыметы тэксту і дайце ім характарыстыку (пры неабходнасці карыстайцеся табліцай).

| **Асноўныя прыметы тэксту** | **Характарыстыка прымет тэксту** |
|---|---|
| Тэматычнае адзінства | Усе сказы і часткі тэксту раскрываюць яго тэму і асноўную думку |
| Паслядоўнасць | У тэксце думка развіваецца паслядоўна, кожны новы сказ дапаўняе і працягвае змест тэксту, дае новую інфармацыю для разгортвання думкі |
| Звязнасць | Сказы ў тэксце звязаны паміж сабой з дапамогай паслядоўнага ці паралельнага спосабу сувязі. Пры паслядоўным спосабе думка перадаецца паслядоўна, кожны наступны сказ звязаны з папярэднім, раскрывае і дапаўняе яго; пры паралельным спосабе ўсе сказы раскрываюць і дапаўняюць змест першага сказа |
| Разгорнутасць | Наяўнасць у тэксце некалькіх падтэм, з дапамогай якіх раскрываецца (разгортваецца) тэма |
| Завершанасць | Тэкст лічыцца завершаным, калі ў ім цалкам раскрыта тэма (з пазіцыі аўтара) |

**11.** Прачытайце загаловак тэксту. Ці можна па ім вызначыць тэму тэксту? Як вы думаеце, пра што можа быць тэкст?

Не чытаючы, прагледзьце тэкст і паспрабуйце па выдзеленых словах і сказах здагадацца, што гаворыцца ў тэксце пра кацяня і Тузіка.

### Кацяня і Тузік

Па цёмнай дарозе ў халоднае дажджлівае надвор'е ішло **маленькае кацяня**[с]**. Было** яму так **холадна і страшна**, што слёзы самі каціліся з вочак. **Кацяня завярнула ў** першы **двор** вёскі і **вырашыла** тут **заначаваць. Аблюбавала для начлегу пустую сабачую будку.** Так прайшла ноч.

**Уранку,** як толькі ўзышло сонейка, настрой кацяняці палепшыўся. Яно ўжо хацела парадавацца новаму дню, але тут **з'явіўся Тузік.** Ён адразу **накінуўся на няпрошанага госця.** Падняўся такі піск і вэрхал, што з хаты **выбеглі гаспадары.** І што яны ўбачылі? Тузік круціўся вакол сябе, каб схапіць зубамі кацяня, якое ўчапілася за яго хвост і матлялася на ім, нібы шарык.

**Дзядуля** з цяжкасцю **разняў** забіяк. Пакрыўджаны сабака забіўся ў будку, а **бабуля забрала кацяня ў хату. Гаспадары накармілі і напаілі яго,** пасадзілі на печ пагрэцца. Ад удзячнасці кацяня завуркатала.

**Так і засталося яно жыць**[ф] **у бабулі з дзядулем.** Праз некаторы час **кацяня і Тузік пасябравалі.** Нават елі з адной міскі *(Паводле Г. Нічыпаровіч)*.

Прачытайце тэкст, вылучаючы голасам выдзеленыя словы. Ці адпавядае змест тэксту вашым меркаванням пра яго? Як вы думаеце, чаму так адбылося?

Разгледзьце схему раскрыцця тэмы і асноўнай думкі тэксту.






Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

Раскажыце, колькі падтэм выкарыстаў аўтар для таго, каб раскрыць тэму. Ці супадаюць яны з абзацамі?

Назавіце апорныя (ключавыя) словы і сказы ў кожнай падтэме. Ці дапамагаюць яны зразумець сэнс тэксту?

> **!** **Апорныя (ключавыя) словы і выразы** — словы, якія перадаюць асноўную інфармацыю тэксту. Гэта могуць быць асобныя словы, спалучэнні слоў і нават цэлыя сказы.

**12.** Запішыце сказы ў такой паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст. Устаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі. Дайце тэксту загаловак.

1. Зімой, калі за *(?)*окнамі лютуе м..роз. 2. Родная з..мля прыгожа.. *(у/ў)* кожную пару года. 3. Летам, калі нізка над з..млёй, шчабечучы, носяцца ластаўкі, а на палянках густа чырванею*(т/ць)* буйны́я і спелыя суніцы. 4. В..сной, калі стройныя таполі н..смела выпускаю*(т/ць)* клейкія і пахучыя з..лёныя лісточкі. 5. Адна пара́ года змяняе другую, але кожная з іх па-свойму адметная, н..паўторная і прыгожая. 6. Прыгожая наша з..мля і ў*(?)*осень, калі ў кронах б..роз з*(?)*яўляюцца першыя з..латыя лісточкі *(Паводле Я. Галубовіча)*.

Падкрэсліце апорныя (ключавыя) словы, спалучэнні слоў або сказы.

## § 3. Паглыбленне паняцця пра апавяданне, апісанне і разважанне

**13.** Вызначце, які з тэкстаў з'яўляецца апавяданнем, які — апісаннем, а які — разважаннем. Сваё меркаванне абгрунтуйце.

**І.** Аднаго разу малы Францішак надумаў зрабіць сабе пячатку. Акуратна вы́разаў на дошчачцы літары, а пасля ўзяў з печы са́жу*, змяшаў са шмальцам* і густа намазаў пячатку. А потым прыклаў яе да тонкага беласнежнага абруса, што ляжаў на стале.

Які жах! Замест прыгожых літар стаялі нейкія незразумелыя знакі. Каб схаваць надпіс, Францішак хуценька перавярнуў абрус. І — о цуд! Пасярод стала́ цяпер зграбна красавалася па-стараславянску выпісанае — слова СКОРИНА *(Паводле А. Клышкі)*.